Канферэнц-зала

# Дзеці ў бядзе

*Летась у Беларусі ахвярамі злачынстваў сталі больш за 7 тысяч непаўнагадовых*

**Самымі безабароннымі ў свеце з'яўляюцца дзеці. Яны становяцца лёгкай здабычай гвалтаўнікоў, порнадзялкоў, гандляроў «жывым таварам» і паляўнічых за чалавечымі органамі.**

**Шляхі спынення гвалту супраць дзяцей учора ў Мінску шукалі больш за 100 удзельнікаў міжнароднай канферэнцыі з 27 краін свету.**

Як адзначыла падчас адкрыцця форуму **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Наталля ПЯТКЕВІЧ**, для Беларусі праблема гвалту над дзецьмі менш вострая, чым для іншых краін свету. За апошнія 3 гады колькасць злачынстваў сэксуальнага характару ў дачыненні да непаўнагадовых істотна знізілася. Калі ў 2005 годзе было 330 такіх фактаў, то ў 2007-м — 198. Увогуле, гаварыць аб поўнай перамозе над крыўдзіцелямі дзяцей у нашай дзяржаве таксама рана. Паводле звестак МУС, летась толькі па ўзбуджаных крымінальных справах былі прызнаны пацярпелымі больш за 7 тысяч непаўнагадовых. Ахвярамі гандляроў жывым таварам у мінулым годзе сталі 23 падлеткі, 22 непаўнагадовыя ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў былі ўцягнуты ў сэксуальную эксплуатацыю. Зафіксаваны выпадкі выкарыстання дзяцей у якасці працоўных рабоў.

Жорсткія адносіны да дзяцей выклікаюць ланцуговую рэакцыю. Непаўнагадовыя ахвяры злачынстваў ці проста зверскага абыходжання з боку бацькоў нярэдка самі становяцца на крымінальную сцежку. Толькі летась у Беларусі падлеткамі было здзейснена 25 забойстваў, нанесена 63 цяжкія цялесныя пашкоджанні, учынена 26 згвалтаванняў, 3855 крадзяжоў, 590 рабаванняў, 114 разбояў, 219 махлярстваў, 870 хуліганстваў, 84 злачынствы, звязаныя з незаконным абаротам наркотыкаў.

**Пазалетась у свеце было зафіксавана 5,6 мільёна маленькіх рабоў, 1,8 мільёна дзяцей былі ўцягнуты ў прастытуцыю і парнаграфію.**

Але асаблівую трывогу **міністра ўнутраных спраў Беларусі Уладзіміра НАВУМАВА** выклікаюць злачынствы, звязаныя з распаўсюджваннем дзіцячай парнаграфіі. У прыватнасці, адказваючы на пытанне «Звязды», кіраўнік МУС заявіў, што ў беларускім заканадаўстве ёсць прабелы, якія датычацца пакарання за распаўсюджванне дзіцячай парнаграфіі. Менавіта гэта, на думку міністра, стала прычынай з'яўлення ў нашай краіне дзіцячай порнасеткі. Паводле слоў Уладзіміра Навумава, інфармацыя аб гэтай порнасетцы трапіла да беларускіх праваахоўнікаў з Германіі. У Мінску былі праведзены аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы, у выніку якіх удалося затрымаць арганізатараў порнасеткі: грамадзян Беларусі, Расіі і Украіны. Як бачна, беларускія дзеці сталі ахвярамі міжнароднай злачыннай групоўкі. Наогул, як падкрэсліла Наталля Пяткевіч, «важна навесці парадак не толькі ў сябе дома». Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта адзначыла, што праблема абароны дзяцей ад гвалту мае глабальны характар і вырашыць яе можна толькі сумеснымі намаганнямі ўсёй сусветнай супольнасці. Дарэчы, паводле слоў Наталлі Пяткевіч, неабходна выпрацаваць адзіную стратэгію ААН, накіраваную на вырашэнне такіх праблем, як гандаль людзьмі, гвалт у дачыненні да дзяцей і жанчын. Таму Беларусь разам з 10 іншымі дзяржавамі свету ініцыявала правядзенне тэматычных дэбатаў Генеральнай Асамблеі ААН па праблеме гандлю людзьмі. Дэбаты адбудуцца 3 чэрвеня гэтага года ў штаб-кватэры ААН у Нью-Йорку.

**Дзвюх маленькіх балгарскіх рабынь прымушалі плаваць у акварыуме разам з піраннямі і сядзець у тэрарыуме са змеямі...**

Ідэю разам абараняць дзяцей падтрымала **каардынатар АБСЕ па барацьбе з гандлем людзьмі Эва БІОДЭ**. Спецыяльны прадстаўнік памянёнай міжнароднай арганізацыі агучыла жахлівую статыстыку. У прыватнасці яна паведаміла, што пазалетась у свеце было зафіксавана 5,6 мільёна маленькіх рабоў, 1,8 мільёна дзяцей былі ўцягнуты ў прастытуцыю і парнаграфію. «Нават немаўляты становяцца прадметамі гандлю і матэрыялам для педафілаў, парнографаў і трафікёраў», — заявіла спадарыня Біодэ. Паводле яе слоў, прыкладна палову ўсіх ахвяраў гандляроў людзьмі складаюць дзеці. Найчасцей маленькіх рабоў выкарыстоўваюць у сэкс-бізнэсе, сельскай гаспадарцы, прымушаюць жабраваць. Эва Біодэ распавяла гісторыю пра дзвюх балгарскіх дзяўчынак, якіх прадалі ў Італію. Там маленькіх рабынь прымушалі плаваць у акварыуме разам з піраннямі і сядзець у тэрарыуме са змеямі...

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

# ІЛЬГОТЫ — ДАЛЁКА НЕ ЎСЁ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

І ўсё ж ці не найбольш значнай асаблівасцю новай праграмы стала павелічэнне так званага «крытэрыю патрэбы» пры прадстаўленні штомесячных дапамог. Раней такія дапамогі прызначаліся ў выпадку, калі сукупны даход кожнага члена сям'і не перавышаў 60 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму. Сёння ж адрасныя даплаты ўжо робяцца да 100 працэнтаў БПМ.

Як паведаміла **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА**, толькі за сёлетнія студзень—сакавік адрасная дапамога была прызначана на 45,3 тыс. сем'яў ці на 129,1 тыс. чалавек. Для параўнання: за ўвесь мінулы год дапамогу атрымалі 59,2 тыс. грамадзян Беларусі. Змяніўся і сам склад атрымальнікаў. Калі летась 85 працэнтаў дапамог «пайшло» ў шматдзетныя ці няпоўныя сем'і, то сёлета доля гэтых катэгорый зменшылася да 60,7 працэнта. І, з іншага боку, цяпер права на падтрымку атрымала большая колькасць сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, поўных сем'яў, дзе маці знаходзіцца ў «дэкрэтным» водпуску, а таксама пенсіянераў — да прыкладу, пенсіянераў, якія ў свой час працавалі ў сельскай гаспадарцы, мелі невысокую зарплату і атрымалі невялікі індывідуальны каэфіцыент.

Павелічэнне колькасці зваротаў ужо стала прычынай адной з праблем — недахопу сродкаў на выплату адраснай сацыяльнай дапамогі. Дзякуючы дадатковаму фінансаванню, гэта праблема ўжо вырашана. Нашмат больш вострым аказалася другое пытанне — рост утрыманцкіх настрояў. Таму, нагадала Марыяна Шчоткіна, тут існуюць дакладныя нормы — нягледзячы на даход, ніжэйшы за бюджэт пражытковага мінімуму, адрасныя выплаты не прадастаўляюцца здаровым працаздольным грамадзянам, якія не хочуць працаваць ці без уважлівых прычын працуюць ўсяго на палову стаўкі, індывідуальным прадпрымальнікам, якія маюць ліцэнзіі і не атрымліваюць даходу, сем'ям з інвалідамі III групы ці з дзецьмі ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў, якія не працуюць, не вучацца і не зарэгістраваныя ў якасці беспрацоўных.

Спіс найбольш «папулярных» падстаў для адмовы можна працягваць і надалей. Зрэшты, падкрэсліла Марыяна Шчоткіна, у дадзеным выпадку трэба падыходзіць індывідуальна да кожнага канкрэтнага выпадку. Скажам, занятасць на палову стаўкі можа тлумачыцца тым, што ў сям'і выхоўваецца дзіця-інвалід. І на догляд такога дзіцяці патрабуецца больш часу.

**ПРАВА НА... ПАВАГУ**

Прыняць канчатковае рашэнне аб аказанні падтрымкі павінна камісія па прызначэнні адраснай сацыяльнай дапамогі. Такія камісіі створаныя ва ўсіх раёнах. Бо зразумела — рэальна ацаніць патрэбу ў выплатах з улікам усіх акалічнасцяў можна толькі на месцы.

Прычым у дадзеным выпадку камісіі маюць поўную самастойнасць і могуць ісці на нестандартныя крокі. Праўда, адначасова тыя ж камісіі павінны несці і поўную адказнасць, і ў тым ліку — перад прэтэндэнтамі на адрасную падтрымку. «У выпадку, калі ўзнікаюць спрэчныя моманты, камісія павінна прымаць рашэнне на карысць чалавека, і да таго ж — ставіцца да кожнага з павагай, — адзначыла Наталля Пяткевіч. — Людзі, што апынуліся ў складаным становішчы, не павінны саромецца звяртацца па дапамогу — яны мусяць адчуваць, што ім прадастаўляюць не «міласціну», а цалкам законную гарантыю».

**Сяргей ГРЫБ.**

## Спорт-тайм

### Англійскі паўфінал

Удзельнікамі паўфінальных матчаў Лігі чэмпіёнаў (яны пройдуць 22—23 і 29—30 красавіка) сталі англійскія «Ліверпуль» і «Чэлсі». У 1/4 фіналу «Ліверпуль» выйграў у «Арсенала» **(на фота)** па суме двух матчаў (1:1 і 4:2), а «арыстакраты» перамаглі турэцкі «Фенербахчэ» ў гульні ў адказ — 2:0 (вынік першай сустрэчы 2:1 на карысць туркаў). У складзе «кананіраў» вызначыўся беларускі паўабаронца Аляксандр Глеб, які аддаў галявы пас на 13-й хвіліне паядынку, калі каманда Арсена Венгера адкрыла лік. Яшчэ два паўфіналісты вызначыліся ўчора вечарам.



### Гол цаной траўмы

Беларускі паўабаронца самарскіх «Крылаў Саветаў» Цімафей Калачоў атрымаў траўму мышцы пахавіны ў матчы чарговага тура чэмпіянату Расіі з уладзівастоцкай дружынай «Луч-Энергія». Аднак менавіта ў гэтым эпізодзе на 65-й хвіліне матча, «Крылы Саветаў» зарабілі штрафны ўдар, які і рэалізавалі. Каб аднавіцца ад траўмы, беларускаму футбалісту патрэбна праходзіць курс лячэння прыкладна тры тыдні.

### Эстафета Алімпійскага агню працягнецца

Міжнародны алімпійскі камітэт не будзе спыняць эстафету Алімпійскага агню, якая ўжо дасягнула Сан-Францыска. Аб гэтым заявіў прэзідэнт Міжнароднага алімпійскага камітэта Жак Раге на экстранным пасяджэнні выканкама МАК. Справа ў тым, што арганізатарам даводзілася некалькі разоў тушыць факел і хаваць яго ў аўтобусе ад актывістаў руху ў падтрымку Тыбета. Магчыма, маршрут эстафеты будзе крыху зменены для падтрымкі бяспекі.

# Сербскія агледзіны баранавіцкай зямлі

*Сербы хацелі б узяць у арэнду 50 тысяч гектараў зямлі ў Баранавіцкім раёне*

Замежныя фірмы праяўляюць пэўную цікавасць да нашых сельгасугоддзяў і хацелі б узяць у доўгатэрміновую арэнду зямлю. А ў некаторых раёнах Беларусі дзелавыя людзі ўжо і арандуюць нашы былыя сельгаскааператывы. Напрыклад, у Клецкім раёне паспяхова працуе грамадзянін Балгарыі, у Ляхавіцкім поўным ходам ідзе ўзвядзенне свінакомплексу датчанамі, а на днях у Баранавіцкі раён заехалі сербы...

Тое, што прапанавала фірма «МК-груп», не магло не здзівіць. Сербы хацелі б узяць у арэнду 50 тыс. гектараў зямлі, каб на ёй сеяць і жаць. А ў раёне ворыва ўсяго 64,9 тысячы, зямля належыць не толькі СВК, але і іншым арганізацыям. Здавалася б, ідэальнае выйсце: аддаць зямлю сербам і няхай у іх баліць галава наконт тэхнікі, паліва, угнаенняў і цэнтнераў, сабраных з гектара. І тады не было б запазычанасці з падаткамі, людзі мелі б работу і ў мясцовай улады не было б сённяшняга клопату. Але ў раёне ёсць шэраг гаспадарак, якія працуюць стабільна, і іх зямлю ніхто перадаваць не збіраецца.

Пачуўшы, што такой колькасці зямлі ў раёне не атрымаць, сербы заявілі, што можна было б спыніцца і на 20 тыс. гектараў, але гэта — мінімум, бо калі зямлі будзе меней, то не ўдасца поўнасцю загрузіць элеватар, які фірма ў такіх выпадках узводзіць да свайго збожжа.

У Баранавіцкім раёне здолелі прапанаваць сербам толькі 10 тыс. гектараў і заявілі, што астатнія дзесяць можна будзе атрымаць у суседніх раёнах, што, у прынцыпе, не праблема. У Ляхавіцкім ці Івацэвіцкім раёнах у арэнду зямлю далі б, але ж не самую лепшую. Ды і гасцей павезлі на тэрыторыю сельгаскааператываў «Мілавіды», «Уцёс», «Застарынне» — гаспадарак, якія ў раёне не ў лідарах: у іх зямля нізкай бальнасці. Вось такія палі райвыканкам і мог бы перадаць сербам у арэнду. Калі б замежныя інвестары пачалі ўкладваць грошы ў гэтыя сельгасугоддзі, то для раёна быў бы вялікі плюс. Але ж і ў гасцей свае інтарэсы. Рабіць фінансавыя ўліванні можна толькі з мэтай, каб атрымаць максімальную аддачу, а з пусткі асаблівага прыбытку не возьмеш.

А калі прадстаўнікам фірмы «МК-груп» сказалі, што арандаваць комплексы і сельгаскааператывы давядзецца разам з іх даўгамі, а яшчэ неабходна будзе аказваць дапамогу пенсіянерам, то тыя нічога канкрэтнага не сказалі. Маўляў, на зямлі будзе парадак, а ў людзей — прыстойная зарплата... Чаго яшчэ хацець? Фірма «МК-груп» ужо дзейнічае ў некаторых краінах СНД, напрыклад, ва Украіне, а ў Беларусь сербы прыехалі на агледзіны і з гэтай прычыны пакінулі за сабой права падумаць. Акрамя Брэстчыны, сербскія бізнэсмены пабываюць у іншых абласцях Беларусі, а гэта значыць, што ў іх ёсць з чаго выбіраць і на якіх умовах.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам» звяртаецца да вас з просьбай аказаць дабрачынную дапамогу Смірновай Таццяне Уладзіміраўне, 1977 года нараджэння, якая пражывае па адрасе: Магілёўская вобл., г. Асіповічы, вул. Дзяржынскага, 71—47. Дзяўчыне жыццёва неабходная аперацыя па трансплантацыі сардэчна-лёгачнага комплексу за мяжой. У Рэспубліцы Беларусь дадзены від аперацыі не выконваецца. Арыенціровачны кошт лячэння за мяжой — 200 000$. Сума вялікая, і ў сям'і ўдавы Марыі Канстанцінаўны Смірновай на выратаванне дачкі яе няма. Але тым не менш маці дзяўчыны і мы верым, што свет не без добрых людзей, і яны з дачкой не застануцца без падтрымкі. Грашовыя сродкі на лячэнне просім пералічваць на разліковыя рахункі, адкрытыя па заключэнні Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь на імя М.К. Смірновай у філіяле № 722 ААБ «Беларусбанк». МФО 153801550 код 550, УНН 700177554:

№ 3134000000074 — у расійскіх рублях
№ 3134000000061 — у еўра
№ 3134000000058 — у доларах ЗША
№ 3134000000045 — у беларускіх рублях.

# ПЛАДОВА-ЯГАДНАЕ ВІНО СТАНЕ БОЛЬШ ЯКАСНЫМ...

*Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў падтрымалі дэкрэт аб дзяржаўным рэгуляванні вытворчасці, абароту і рэкламы алкагольнай прадукцыі*

**Восьмая сесія Палаты прадстаўнікоў ледзь паспела пачацца, а ў складзе дэпутатаў ужо змены. Учора быў датэрмінова вызвалены ад пасады старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Міхаіл Сасонка. Адпаведную заяву ён падаў у сувязі з пераходам на іншую пасаду. У яго звароце да калег падчас пасяджэння ў парламенце адчуваліся шчырасць і непадробнае хвалянне — вядома ж, столькі гадоў працы ў Палаце прадстаўнікоў (ды і лічба адметная — 13). Тайным галасаваннем дэпутаты падтрымалі рашэнне Міхаіла Сасонкі.**

— Міхаіл Паўлавіч прызначаны першым намеснікам адказнага сакратара Парламенцкага сходу Саюзнай дзяржавы, — патлумачыў сітуацыю старшыня Палаты прадстаўнікоў Вадзім Папоў падчас пасяджэння сесіі.

На былой пасадзе Міхаіла Сасонкі цяпер будзе працаваць Людміла Анікеева — менавіта яна была абрана дэпутатамі. Акрамя кадравых момантаў дэпутаты разгледзелі і шэраг іншых пытанняў. У прыватнасці, прынялі да ведама Дэкрэт Прэзідэнта Беларусі аб дзяржаўным рэгуляванні вытворчасці, абароту і рэкламы піва, алкагольнай прадукцыі і тытунёвых вырабаў. Дакумент прадугледжвае адмену квотаў на імпарт алкагольнай прадукцыі, аднак пры знятых колькасных абмежаваннях будзе ўзмоцнены кантроль за якасцю — выключнае права на імпарт замацавана за дзяржавай. Устаноўлена таксама забарона на вытворчасць вінаў з выкарыстаннем этылавага спірту, які атрымліваюць з харчовай сыравіны, пладовых віна-матэрыялаў і спіртаваных сокаў замежнай вытворчасці. Дэкрэт таксама адмяняе маркіроўку суправаджальных дакументаў на маркіраваныя акцызнымі маркамі алкагольныя напоі, што вывозяцца за мяжу (тым самым стымулюецца экспарт).

Якім чынам будзе палепшана становішча беларускіх вытворцаў алкагольнай прадукцыі дзякуючы новаўвядзенням, расказала карэспандэнту «Звязды» **міністр па падатках і зборах Ганна ДЗЕЙКА**:

— Мы разлічваем павялічыць экспарт беларускай алкагольнай прадукцыі. Справа ў тым, што ранейшы Дэкрэт №11 рэгламентаваў такую норму, паводле якой для экспарту было неабходна, каб вытворцы, яшчэ не атрымаўшы саму прадукцыю, давалі фінансавую гарантыю, што прадукцыя гэта будзе рэалізавана. А гэта значыць, адцягваць абаротныя сродкі — велізарныя сродкі, 40 працэнтаў ад аб'ёму паставак. Цяпер такая норма адменена і грошы гэтыя, натуральна, будуць працаваць на вытворчасць. Ды і іншыя дастаткова жорсткія ўмовы функцыянавання гэтай сферы эканомікі адменены, мы ўвогуле ідзём па шляху выроўнівання ўмоў для суб'ектаў гаспадарання незалежна ад формаў уласнасці, такім чынам даём магчымасць канкурыраваць усім вытворцам, імпарцёрам у аднолькавых умовах на тэрыторыі Беларусі і за яе межамі. Беларускія вытворцы выпрацоўваюць каля 22 млн дал пладова-ягадных вінаў і вінных напояў. Пастаўшчыкамі для вытворчасці гэтай прадукцыі з'яўляліся і такія суб'екты гаспадарання, якія да гэтай вытворчасці ніякага дачынення не мелі. Нярэдка падчас праверак, у тым ліку і праведзеных падатковымі органамі, выяўлялася, што вытворчасці як такой па тэхналогіі няма — імпартны сок проста разбаўляецца спіртам, а тое, што атрымалася — выдаецца за пладова-ягаднае віно. Прадукцыя ж гэта звязана са здароўем грамадзян, таму ў першую чаргу тут павінна быць гарантавана якасць. Так што прынятая норма ніякіх суб'ектаў гаспадарання ў правах не ўшчамляе — калі ласка, займайцеся гэтай вытворчасцю, толькі ў адпаведнасці з тымі стандартамі, якія прынятыя ў краіне. Вядома ж, кожная дзяржава абараняе свой рынак, калі мы вырабляем пэўную прадукцыю, чаму б нам не выкарыстоўваць у першую чаргу яе, а не імпартную?

Дэпутаты таксама прынялі ў першым чытанні папраўкі ў крымінальнае заканадаўства і ў некаторыя законы па пытаннях адвакацкай дзейнасці. Так, паводле новага законапраекта, адвакаты змогуць ужо ў працэсе падрыхтоўкі спраў да судовага разбору збіраць неабходныя звесткі (напрыклад, звесткі аб здзейсненым натарыяльным дзеянні, а таксама абагульненую інфармацыю аб правах на аб'екты нерухомасці, якія належаць канкрэтнай асобе) і прадастаўляць іх суду. Мяркуецца, што новаўвядзенні зробяць абарону інтарэсаў нашых грамадзян у судзе больш якаснай.

**Ала МАЧАЛАВА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



## *Толькі пілавінне ляціць!*

**Лясныя гаспадаркі Віцебшчыны рыхтуюцца да чарговага конкурсу вобласці на лепшага ў майстэрстве валіць лес і рэзаць дрэва. У раёнах праходзяць рэгіянальныя і лясгасныя спаборніцтвы. Днямі каля вёскі Вялікія Дольцы прайшоў адкрыты чэмпіянат Ушацкага лясгаса, які выявіў нямала здольных майстроў нялёгкай лясной прафесіі.**

**НА ЗДЫМКУ:** моманты спаборніцтваў на лясной дзялянцы Ушаччыны — удзельнікі і суддзі.

## З РУЖЖОМ НА БАБРА

На меліярацыйным канале «Нагорны» Салігорскага раёна за незаконную здабычу бабра быў затрыманы слесар ЖКГ «Комплекс».

У яго канфіскавана туша жывёліны вагой 20 кілаграмаў, паляўнічае ружжо і боепрыпасы да яго. Урон прыродным рэсурсам ад здабычы бабра ацэнены ў буйным памеры — 2 450 000 рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**8 мая 2008 г. в 11.00 состоится внеочередное собрание акционеров ОАО «Белторгстрой» по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31**

**Регистрация с 10.00. При себе иметь паспорт.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Отчет Ревизионной комиссии.
2. Утверждение годового баланса и отчета о прибылях и убытках за 2007 год.
3. О распределении чистой прибыли и выплате дивидендов за 2007 год.
4. Направления использования чистой прибыли на 2008 год.
5. Выборы членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
6. Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

УНП 100633428

**ОАО «Барановичидрев» уведомляет своих акционеров о проведении 17 апреля 2008 года внеочередного общего собрания акционеров**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О выплате дивидендов по решению общего собрания акционеров за 2006 год.
2. О внесении изменений в Устав Общества.

**Собрание состоится по адресу: г. Барановичи, пос. Восточный, 3, клуб ОАО «Барановичидрев». Начало в 14.00.**

С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться в рабочие дни в период с 7 апреля 2008 года с 9.00 до 17.00 (перерыв с 12.30 до 13.30) в здании заводоуправления, кабинет 9, 10, а в день проведения собрания — в месте проведения собрания с 13.00. Регистрация участников собрания будет проводиться с 13 часов до 13 часов 50 минут по месту проведения собрания при предъявлении документов, удостоверяющих личность, или доверенности представителя акционера, оформленную в установленном порядке. УНН 200299909

**У суд Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **ДАБРАТВОРСКАГА Валерыя Анатольевіча**, 3 чэрвеня 1973 года нараджэння, ураджэнца горада Першамайска Луганскай вобласці Украіны, апошняе вядомае месца жыхарства і знаходжання — горад Касцюковічы,кастрычнік 2002 года.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзяніна Дабратворскага В.А., паведаміць іх суду Касцюковіцкага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У сувязі з паступіўшым **у суд Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці** заявы аб аб'яўленні памерлым **ЮРЧЫКА Аляксандра Аляксандравіча,** 07 красавіка 1949 года нараджэння, ураджэнца в. Вялікая Волахва Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства — г. Баранавічы Брэсцкай вобласці, вул. Чарнышэўскага, дом 127.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзяніна Юрчыка А.А., паведаміць іх суду Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці на адрас: г. Ляхавічы Брэсцкай вобл., вул. Першамайская, дом 6, на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

## Абзац

■ **Рэактыўны комплекс «Кацюша» пакінуў свой пост на мемарыяле «За нашу савецкую Радзіму» ў Оршы. Упершыню за больш чым 40 гадоў пачалася рэканструкцыя гэтага свяшчэннага месца. Дакладная копія ўстаноўкі рэактыўнага мінамётнага комплексу «БМ-13», вядомага як «Кацюша», накіравана на капітальны рамонт на аршанскі завод «Чырвоны баец». На працягу месяца будуць адноўленыя пашкоджаныя часам дэталі.**

■ Спецыялісты завода «Выдатнае ліццё» ў Мінску прыступілі да адліўкі скульптуры Пятру І, якая будзе ўстаноўлена ў Сочы. Скульптура будзе вышынёй 3 м і вагой 2,5—3 т. Урачыстае адкрыццё помніка намечана на 1 мая.

■ **У выніку моцнага ветру ў аўторак у краіне разбураны дахі 22 жылых дамоў і 95 сельскагаспадарчых будынкаў. Хуткасць ветру дасягала 22 метраў у секунду. Перабоі з электразабеспячэннем зафіксаваныя ў 688 населеных пунктах. Больш за ўсё пацярпелі Віцебская і Мінская вобласці, крыху менш — Магілёўская.**

■ Працаўнікі ААТ «Лучоса» Віцебскага раёна пры правядзенні земляных работ у полі каля вёскі Заходнікі наткнуліся на склад мінамётных мін. Група размініравання дастала з зямлі 276 боепрыпасаў нямецкай вытворчасці. Яшчэ адзін склад боепрыпасаў выяўлены непадалёк ад вёскі Ражнова. Пры распрацоўцы кар'ера экскаватаршчык зачапіў металічны прадмет, падобны на снарад. На прылеглай тэрыторыі выяўлена 47 падобных снарадаў.

■ **Разбуральныя паводкі, выкліканыя праліўнымі дажджамі ў паўднёва-ўсходняй частцы Бразіліі, сталі прычынай гібелі па меншай меры 34 чалавек, каля 190 тыс. жыхароў пазбавіліся даху над галавой. У рэгіёне загінула амаль уся хатняя жывёла і знішчаны сельскагаспадарчыя палі, размытыя ўсе дарогі, разбураныя масты.**

■ Брытанскія вучоныя прыйшлі да высновы, што па колькасці радзімак можна вызначыць біялагічны ўзрост чалавека, а таксама высветліць, наколькі хутка праходзяць у яго арганізме працэсы старэння. Абследаваўшы 900 пар блізнят, яны прыйшлі да высновы: чым больш у чалавека радзімак, тым большая верагоднасць таго, што яго ДНК валодае механізмам абароны ад старэння. Высновы вельмі нечаканыя, паколькі да апошняга часу галоўнай асаблівасцю людзей з мноствам радзімак лічылася павышаная схільнасць да раку скуры. Аднак, на думку вучоных, нязначная рызыка злаякасных новаўтварэнняў у такіх людзей з запасам кампенсуецца меншай схільнасцю да ўзроставых захворванняў — хваробаў сэрца, астэапарозу і інш.

## Поўны абзац

■ **Ва Украіне з'явіліся Адамава Ева і Праведна-Шчаслівы Аладзін. Такія імёны вырашылі ўзяць сабе замест ранейшых Калодзіна Юля і Нападоўскі Андрэй. У апошні час былі зменены прозвішчы Прышыблянскі на Мельнічук, Мяшок на Жураўскі, Лапата на Маліноўскую, Лох на Любімаву, Локшына на Фартуна і інш. Штогод ва Украіне мяняюць уласныя імёны ад 15 да 19 тыс. грамадзян. Ужо сёлета зарэгістравана 4 тыс. такіх фактаў.**

**Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.**

Тэлесеткі

# «БЕЛАРУСЬ-ТБ» УБАЧАЦЬ У ПАЎНОЧНАЙ АМЕРЫЦЫ

**Складзі сваё ўяўленне пра жыццё і падзеі ў Беларусі змогуць жыхары ЗША, Канады, а таксама Мексікі, Гватэмалы, Пуэрта-Рыка, Кубы і Дамініканскай Рэспублікі. На тэрыторыі гэтых краін цяпер распаўсюджваецца сігнал канала «Беларусь-ТБ».**

Вяшчанне пачалося дзякуючы дамоўленасці з кампаніяй «France Telecom», даччынае падраздзяленне якой GlobeCast распаўсюджвае ў ЗША больш як 200 міжнародных тэле- і радыёканалаў на 35 мовах з 42 краін свету. У прыватнасці, беларускі тэлеканал уваходзіць у пакет нароўні з азербайджанскім, армянскім, ізраільскім і двума расійскімі каналамі, якія запатрабаваныя ў амаль 10-мільённай аўдыторыі рускамоўнай дыяспары. Прычым, паводле слоў дырэктара дырэкцыі «Беларусь-ТБ» Валерыя Радуцкага, эмігранты выказалі зацікаўленасць менавіта ў дзяржаўным тэлеканале — «унутранай вытворчасці» прыватнага тэлебачання ім і без таго хапае. Нашым суайчыннікам «Беларусь-ТБ» прапануе вялікі спектр культурных і забаўляльных, спартыўных, асветніцка-адукацыйных, сацыяльна-палітычных праектаў, дакументальных і мастацкіх фільмаў, а таксама навінаў — на рускай і беларускай мове. А вось рэкламы ў эфіры спадарожнікавага тэлеканала няма ўвогуле, бо канал мае канцэпцыю некамерцыйнага.

Увогуле на дадзены момант, паводле слоў кіраўніка тэлеканала, патэнцыяльная аўдыторыя «Беларусь-ТБ» складае каля 220 мільёнаў чалавек.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## ЗАРЭЗАЎ ЖОНКУ І ЯЕ СЯСТРУ

**Трагічныя падзеі мелі месца ў вёсцы Купінск Навагрудскага раёна, дзе п'яны мужчына зарэзаў жонку і яе сястру.**

30-гадовы жыхар вёскі Далгінава Карэліцкага раёна ў доме купінскай пенсіянеркі не паладзіў з жонкай: спрэчка ўспыхнула з-за рэўнасці. Слова за слова — і злачынца схапіўся за нож, які пусціў у ход. Яго 27-гадовая жонка загінула на месцы здарэння, а вось яе 24-гадовую сястру, якая знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці, пасля гэтых разборак з раненнямі даставілі ў бальніцу. На жаль, і апошнюю ахвяру раўніўца ўрачам не ўдалося выратаваць. Што тычыцца забойцы, то ён знік з вёскі, дзе нарабіў бяды, на таксі. Затрымалі крымінальніка ў яго роднай вёсцы.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ЧУЖЫМІ РУКАМІ

У Гродне супрацоўнікі міліцыі затрымалі 27-гадовага грамадзяніна Індыі, студэнта Гродзенскага дзяржаўнага медуніверсітэта, які падазраецца ва ўчыненні злачынства.

У прыватнасці, як мяркуецца, гэты студэнт за 200 долараў ЗША наняў мясцовага 30-гадовага жыхара, раней судзімага за махлярства і незаконны абарот наркотыкаў, каб той збіў грамадзяніна Сірыі. Апошні, дарэчы, мае пасведчанне на правы жыхарства ў Беларусі.

**Дзмітрый СТАНКОВІЧ.**



## БАСО — Бухгалтерский баланс ЗАСО «БАСО» за 2007 год

*млн руб.*

| АКТИВ | | ПАССИВ | |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Основные средства | 1916,5 | Источники собственных средств — всего | 2378,3 |
| Нематериальные активы | 0,9 | В том числе: | |
| Финансовые вложения — всего | | уставный фонд | 155,6 |
| В том числе: | | резервный фонд | |
| инвестиции в дочерние общества | | добавочный фонд | 1741,9 |
| инвестиции в другие организации | | фонд накопления | 60,0 |
| облигации и другие долговые обязательства | | фонд потребления | |
| прочие финансовые вложения | | целевое финансирование | |
| Доля перестраховщиков в страховых резервах | 506,5 | нераспределенная прибыль прошлых лет | |
| Дебиторы — всего | 173,2 | нераспределенная прибыль отчетного года | 420,8 |
| В том числе: | | Страховые резервы и фонды — всего | 2713,3 |
| дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования | 61,0 | В том числе: | |
| | | страховые резервы | 2676,8 |
| депо премий по рискам, принятым в перестрахование | | фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 36,5 |
| | | гарантийные фонды | |
| дебиторкая задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 112,2 | Кредиторы — всего | 332,7 |
| | | В том числе: | |
| Прочие активы — всего | 4479,7 | кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования | 7,6 |
| В том числе: | | кредиторская задолженность по операциям перестрахования | 50,4 |
| незавершенное строительство | | | |
| материальные ценности и затраты | 84,1 | депо премий по рискам, переданным в перестрахование | |
| денежные средства | 4395,6 | | |
| собственные акции (доли) | | заемные средства | 21,5 |
| прочие активы | | кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 253,2 |
| Непокрытые убытки прошлых лет | | | |
| Непокрытые убытки отчетного года | | Прочие пассивы | 1652,5 |
| БАЛАНС | 7076,8 | БАЛАНС | 7076,8 |

## Отчет о финансовых результатах ЗАСО «БАСО» за 2007 год

| Наименование показателя | Код строки | За отчетный период |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| **I. Страхование жизни** | | |
| Страховые взносы (премии) | 010 | |
| Страховые выплаты | 020 | |
| Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -) | 030 | |
| Отчисления в гарантийный фонд | 040 | |
| Расходы на ведение дела | 041 | |
| Результат от операций по страхованию жизни (+ или -) | 050 | |
| **II. Страхование иное, чем страхование жизни** | | |
| Страховые взносы (премии) нетто-перестрахование | 064 | 2785,5 |
| Изменение резерва незаработанной премии — нетто-перестрахование (+ или -) | 067 | -343,5 |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто-перестрахование | 082 | 896,2 |
| Изменение резервов убытков — нетто-перестрахование (+ или -) | 092 | 392,8 |
| Изменение других технических резервов (+ или -) | 100 | |
| Изменение иных страховых резервов (+ или -) | 105 | |
| Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды | 110 | 19,5 |
| Расходы на ведение дела | 120 | 716,3 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование | 121 | 85,6 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование | 122 | 220,4 |
| Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -) | 130 | 1068,0 |
| **III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II** | | |
| Операционные доходы | 140 | 176,8 |
| Операционные расходы | 145 | 4,0 |
| Внереализационные доходы | 150 | 354,8 |
| Внереализационные расходы | 155 | 170,8 |
| Использовано прибыли | 156 | 1004,0 |
| Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -) | 170 | 420,8 |

По данной отчетности составлено безусловно положительное аудиторское заключение.

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность ЗАСО «БАСО» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 1 января 2008 г. и результата финансово-хозяйственной деятельности за 2007 г.

**Директор А.Г. Дементьев** **Главный бухгалтер Т.Р. Криводубская**

УНП 100367422